**А. І. Смолік,**
*загадчык кафедры культуралогіі,*
*доктар культуралогіі, прафесар*

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС «ТЭОРЫЯ КУЛЬТУРЫ» ЯК СРОДАК ФАРМІРАВАННЯ ПРАФЕСІЙНАЙ І АСОБАСНАЙ КАМПЕТЭНТНАСЦІ СПЕЦЫЯЛІСТА

Да сучаснай вучэбна-метадычнай літаратуры новага пакалення адносяцца вучэбна-метадычныя комплексы (ВМК) па сацыяльна-гуманітарных дысцыплінах, якія змяшчаюць неабходныя студэнту сістэмныя па характары і структуры тэарэтычныя і метадычныя матэрыялы.

Канцэптуальна-базавы сегмент ВМК «Тэорыя культуры» – гэта сукупнасць узаемазвязаных дыдактычных элементаў: вучэбная праграма, планы семінарскіх заняткаў, тэсты розных узроўняў складанасці, трэнінгі па шэрагу раздзелаў праграмы, пералік тэарэтычных і практычных праблем для рэфератаў, курсавых і дыпломных работ, найбольш значныя фрагменты арыгінальных тэкстаў заснавальнікаў навукі аб культуры, слоўнік культуралагічных дэфініцый, кантрольныя пытанні да заліку і экзамену, метадычныя парады студэнтам і выкладчыкам, наглядна-графічныя матэрыялы, спіс літаратуры і г. д.

Цэнтральнае месца ў комплексе займае кароткі канспект лекцый, адрасаваных студэнцкай аўдыторыі, тэксты якіх адпавядаюць патрабаванням міждысцыплінарнай інтэграцыі і сучаснай інфармацыйнай парадыгмы грамадскай думкі. У ВМК уваходзяць лекцыі, якія не дубліруюць змест іншых сацыяльна-гуманітарных дысцыплін, пазбаўленыя маніпуляцый з інфармацыяй, якая размешчана ў глабальнай і айчыннай інфармацыйнай прасторы. Тэксты ўяўляюць сабой інфармацыю тэарэтычна-практычнага характару ў выглядзе сукупнасці звестак аб новых артэфактах, з’явах і працэсах у матэрыяльнай і духоўнай культуры, а таксама адпаведныя прыклады і парады выкарыстання атрыманых тэарэтычных ведаў у сацыякультурнай практыцы. Дыдактычнае прызначэнне лекцыйнага матэрыялу заключаецца ў тым, каб «увесці» студэнтаў у фундаментальную культуралогію, азнаёміць з яе асноўнымі прынцыпамі, катэгорыямі, заканамернасцямі, паказаць яе метадалогію і логіку, значэнне тэорыі для сацыякультурнай практыкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Лекцыйныя тэксты разлічаны на выкарыстанне разнастайных відаў лекцыі: традыцыйнай (акадэмічнай, інфармацыйна-тлумачальнай, апавядальнай), праблемнай (лекцыя-гутарка, дыялогавая, лекцыя-дыскусія і інш.). Усе лекцыі дазваляюць выкладчыку рэалізоўваць прынцыпы навуковасці, інфарматыўнасці, развіваючага навучання. Падача лекцыйнага матэрыялу характарызуецца лагічнасцю, даказальнасцю, дакладнасцю вызначэнняў і фармулёвак, адсутнасцю разыходжанняў у інтэрпрэтацыі пэўных з'яў і працэсаў культуры. У тэксце змяшчаюцца навуковыя тэрміны з абавязковым іх тлумачэннем, асноўныя думкі, факты, цытаты і дэталі, якія пацвярджаюць і ілюструюць важнейшыя палажэнні разглядаемай тэмы. Лекцыйны матэрыял, уведзены ў ВМК, прадугледжвае выкарыстанне разнастайных тыпаў лекцый, метадаў выкладу лекцыйнага тэксту, сучасных адукацыйных тэхналогій.

Значнае месца ў навукова-метадычным кампаненце ВМК па культуралогіі, акрамя тэкстаў лекцый, займаюць матэрыялы для семінарскіх заняткаў. Семінары разглядаюцца як своеасаблівая лабараторыя творчага мыслення будучага спецыяліста сацыякультурнай сферы, менавіта яны дазваляюць выкладчыку ствараць атмасферу творчасці і крэатыўнасці студэнтаў. На аснове тэм і падабранага да іх матэрыялу выпрацоўваюцца ў будучых культуролагаў уменні і навыкі выкарыстання тэарэтычных ведаў для вырашэння канкрэтных праблем у сферы культуры. Семінарскія заняткі даюць магчымасць студэнту непасрэдна мець зносіны з выкладчыкам, знаходзіцца ў стане супрацоўніцтва падчас пошуку ісціны. Засваенне тэм, вынесеных на семінары, патрабуе сумеснай актыўнай вучэбнай дзейнасці ўсіх студэнтаў акадэмічнай групы.

Выкладанне тэорыі культуры патрабуе не толькі прадастаўлення кожнаму студэнту структураванай, мэтанакіраванай і матываванай інфармацыі аб паняційна-метадалагічным змесце культуралогіі, спосабах дзейнасці і галінах выкарыстання ведаў, якія прадбачацца ў будучай прафесіі. Не менш важна сфарміраваць у будучых спецыялістаў патрэбнасці да самастойнай вучэбна-пазнавальнай дзейнасці. Роля і месца самастойнай работы ў засваенні культуралагічных ведаў вызначаецца сучаснымі патрабаваннямі да выпускніка, неабходнасцю павышэння якасці адукацыі і адначасова змяншэння часу, энерга- і працазатрат выкладчыка і студэнта на падрых-

тоўку да традыцыйных лекцыйных, семінарскіх, практычных і іншых заняткаў. Усё гэта садзейнічала ўключэнню ў ВМК асобнага раздзела, у якім распрацаваны дыдактычны матэрыял, разлічаны на засваенне значнай часткі тэорыі культуры самастойна. З гэтай мэтай у раздзеле вызначаны тэмы, важнейшыя яе праблемы, неабходная літаратура і метадычныя парады па арганізацыі самастойнай работы.

Завяршаецца этап засваення тэорыі культуры курсавой работай па адной з актуальных праблем фундаментальнай культуралогіі. Дадзены від самастойнай работы прадугледжвае паглыбленае вывучэнне тэарэтычных пытанняў культуралогіі, сістэматызацыю назапашаных у працэсе лекцыйных і семінарскіх заняткаў культуралагічных ведаў, набыццё навыкаў і ўменняў, неабходных для навукова-даследчай дзейнасці і вырашэння прафесійных задач. Студэнту, які выконвае курсавую работу па канкрэтнай праблеме фундаментальнай культуралогіі, ставіцца задача навукова прааналізаваць пэўны артэфакт культуры, выявіць факталогію яго існавання, параўнаць розныя тэарэтычныя аспекты яго вывучэння, праясніць спецыфіку спосабу быцця артэфакта ў сучаснай культуры, сэнс і змест яго функцыянавання ў сацыяльнай практыцы. Таму ў раздзеле ВМК «Курсавыя работы» змешчаны ключавыя тэмы фундаментальнай культуралогіі, прыкладны план вывучэння яе, манаграфічная літаратура і крыніцы, з дапамогай якіх можна падрыхтаваць тэкст курсавой работы, а таксама алгарытм яе выканання.

Заданні па курсавой рабоце і яе абарона прадугледжваюць выкарыстанне студэнтамі тэарэтычных ведаў, якія атрыманы на занятках па курсе «Метадалогія і метады культуралагічных даследаванняў». Пры даследаванні пэўнай праблемы ў межах курсавой работы студэнт павінен на практыцы выкарыстаць шэраг аналітычных прыёмаў, аперацый і працэдур, якімі карыстаюцца даследчыкі феноменаў культуры, прымяніць як агульнанавуковыя, так і ўласна культуралагічныя метады пазнання.

Апрабацыя ВМК па тэорыі культуры сведчыць: важнае значэнне ў працэсе засваення тэарэтычных ведаў адыгрывае трэнінг, падчас якога фарміруюцца навыкі інтэрпрэтацыі меркаванняў культуролагаў, аналізу культурных тэкстаў, агляду культуралагічных публікацый, замацавання катэгорый навукі па тэмах курса, тлумачэнне канцэптуальных ідэй, па-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзей і працэсаў у сферы культуры, віртуальнага і непасрэднага дыялогу з персаналіямі навукі, авалоданне майстэрствам публічнага выступлення.

Плённым відам трэнінгу з'яўляецца тэст, які дае магчымасць студэнту праявіць свой інтэлектуальны патэнцыял, грамадзянскую пазіцыю, свабодна і крытычна мысліць, аб'ектыўна ацэньваць якасць засвоеных ведаў, навыкаў і ўменняў. Тэсты, якія ўключаны ў ВМК, адпавядаюць базавым крытэрыям: адлюстроўваюць сучасны ўзровень развіцця культуралогіі, яе тэндэнцыі і заканамернасці, маюць плюралістычны спектр канцэптуальных ідэй і падыходаў культуролагаў да сацыякультурных працэсаў; развіваюць здольнасці крытычна ацэньваць працэсы сацыядынамікі культуры і г. д. Якасць тэстаў вымяраецца трыма паказчыкамі: а) запамінаннем і ўзнаўленнем інфармацыі, закладзенай у тэсце; б) інтэрпрэтацыяй, сістэматызацыяй і аналізам артэфактаў, працэсаў і з'яў культуры; в) здольнасцю студэнта творча іх выкарыстаць падчас практычнай дзейнасці.

Такім чынам, практыка ўкаранення ў навучальны працэс комплексу «Тэорыя культуры» паказвае, што інавацыйны рэсурс, увасоблены ў ім, стымулюе працэс грамадска-палітычнай сацыялізацыі студэнтаў, фарміруе творчае, спрыяльнае для дыялогу і калектыўнага пошуку ісціны адукацыйнае асяроддзе, узбагачае каштоўнасны змест вывучаемай студэнтамі культуралагічнай дысцыпліны і навыкаў даследчыка духоўнай і матэрыяльнай культуры. Прафесійна распрацаваны комплекс уяўляе сабой інтэрактыўны механізм грамадскай сацыялізацыі асобы спецыяліста сацыякультурнай сферы, якасную дыягностыку ведаў, уменняў і навыкаў.

Параўнальны аналіз яго з традыцыйнай вучэбна-метадычнай літаратурай дазваляе разглядаць ВМК як сапраўдную інавацыйную дыдактычную літаратуру, якая забяспечвае мэтанакіраванае фарміраванне сацыяльна-прафесійнай кампетэнтнасці будучага спецыяліста сферы культуры. Іманентны патэнцыял комплексу выяўляецца ў рацыянальным спалучэнні і ўзаемадзеянні ў вучэбна-выхаваўчым працэсе традыцыйных і інавацыйных метадаў, якія забяспечваюць мабільныя і ўстойлівыя зваротныя сувязі паміж выкладчыкам і студэнтамі. Па сваёй структуры і змесце ВМК з'яўляецца альтэрнатывай метадыкам, якія выкарыстоўваліся ва ўстановах вышэйшай адукацыі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

на этапе станаўлення культуралогіі як вучэбнай і навуковай дысцыпліны. Комплекс уяўляе сабой сістэмны, універсальны арганізацыйна-метадычны інструмент, які адпавядае акадэмічным крытэрыям: фундаментальнасці, інфарматыўнасці, сацыякультурнай накіраванасці. Яго метадычны і інфармацыйна-аналітычны патэнцыял садзейнічае раскрыццю і ўзбагачэнню творчых магчымасцей студэнтаў, рэалізацыі функцый культуралогіі як інтэгратыўнай сацыяльна-гуманітарнай дысцыпліны.

1. *Вішнеўскі, М.* Пытанні аптымізацыі сацыяльна-гуманітарнай адукацыі ў ВНУ / М. Вішнеўскі // Выш. шк. – 2011. – № 6. – С. 19–22.

2. *Жук, О. Н.* Компетентностный подход в высшем профессиональном образовании / О. Н. Жук // Адукацыя і выхаванне. – 2004. – № 12. – С. 41–48.

3. *Хуторской, А. В.* Ключевые компетенции как компонент личностно ориентированной парадигмы образования / А. В. Хуторской. – Нар. образование. – 2003. – № 2. – С. 58–64.

4. *Яскевич, Я. С.* Аргументация в науке / Я. С. Яскевич. – Минск : Университетское, 1992. – 142 с.

**А. М. Стельмах,** *доцент кафедры менеджмента социокультурной деятельности, кандидат искусствоведения*

## ФОРМИРОВАНИЕ КОММУНИКАТИВНОЙ КУЛЬТУРЫ СТУДЕНТОВ В ПРОЦЕССЕ ПРЕПОДАВАНИЯ ДИСЦИПЛИНЫ «ВЕДЕНИЕ КУЛЬТУРНО-ДОСУГОВЫХ ПРОГРАММ»

Коммуникативная культура современных культурологов-менеджеров – это один из важнейших элементов их будущей профессии, связанный со способностью целенаправленного взаимодействия с разными целевыми группами: коллегами, заказчиками и зрителями, исполнителями и техническими специалистами. Основу коммуникативной культуры составляют умения, основанные на языковой и речевой компетенции (свободное использование разнообразных языковых и речевых средств в любых условиях). Следовательно, одной из ключевых задач формирования коммуникативной культуры студентов-менеджеров является совершенствование навыков беглой, точной и эмоционально выразительной речи.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ